ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

# «ДАХ ПАЦЁК, ТАВАРЫ ВЫВЕЗЛІ»

## Жыхары вёскі хвалююцца, што на зіму застануцца без крамы

**КАЛІ жыхары буйных гарадоў збіраюцца па пакупкі, яны звычайна не ведаюць, куды пайсці: столькі крам побач з домам! У вёсках сітуацыя зусім іншая. Гандлёвых аб'ектаў на сяле адзінкі, і калі які-небудзь з іх закрываюць, для мясцовых гэта — сапраўдная трагедыя. Нядаўна ў рэдакцыю звярнуліся жыхары вёскі Лескавічы Шумілінскага раёна. Пад лістом з просьбай выратаваць краму падпісаліся 50 чалавек.**

### РАМОНТ ДОЎГА АДКЛАДАЛІ

Сяльчанін Мікалай Рыгоравіч Макаранка расказвае: магазін спажыўтаварыства закрылі ў пачатку кастрычніка. У тыпавым цагляным будынку пацёк дах. Але замест таго, каб памяшканне адрамантаваць, тавары вывезлі, а сам гандлёвы аб'ект закрылі.

— У нашай вёсцы пражываюць 175 чалавек. Акрамя карэнных жыхароў, паслугамі крамы карысталіся навучэнцы гімназіі, а ў летні час — дачнікі і тыя, хто адпачывае на мясцовым возеры, — кажа Мікалай Рыгоравіч.

Магазін у выніку перадалі ў карыстанне Бешанковіцкага райспажыўтаварыства. Ходзяць чуткі, што, магчыма, яго ў арэнду возьме прыватная асоба. Але, па словах Мікалая Макаранкі, вяскоўцам розніцы няма: абы аб'ект працаваў. Вось толькі рамонт доўга адкладалі і распачалі літаральна тыдзень таму.

— Хутка зіма, — хвалюецца суразмоўнік. — Як быць жыхарам вёскі? Прыйдзе канец лістапада, краму не адрамантуюць, а мы пачуем у адказ, што цяпер гэта і немагчыма з-за ўмоў надвор'я.

Найбліжэйшы магазін — у Шуміліне, за сем кіламетраў. Але ж у Лескавічах шмат пенсіянераў, хіба яны находзяцца ў райцэнтр? Пакуль што прадукты прывозіць аўталаўка. «Але яна, ведаеце, як ходзіць? Напішуць, што будзе ў абед, — прыедзе ў дзесяць гадзін раніцы. Людзі ж не могуць увесь дзень сядзець на лаўцы і чакаць», — абураецца наш чытач.

Мікалай Макаранка ўспамінае: 7—8 гадоў таму ў вёсцы хацелі закрываць пошту. Жыхары тады ў «Звязду» звярнуліся, і пытанне вырашылася на іх карысць — аддзяленне пакінулі. Яно і сёння працуе, заўважае Мікалай Рыгоравіч, людзі задаволены. А калі і пошту, і краму закрыць, што ж ад вёскі застанецца?

### МАГАЗІН АДКРЫЮЦЬ ПЕРШАГА СНЕЖНЯ

У Шумілінскім райвыканкаме тлумачаць, што краму закрылі з-за аварыйнага стану. Чаму яе своечасова не адрамантавалі? «На гэта пытанне я спрабавала атрымаць адказ у райспажыўтаварыстве. Яны спасылаюцца на цяжкае фінансавае становішча», — каментуе сітуацыю **намеснік старшыні выканкама па эканоміцы Таццяна ВАРАБ'ЁВА.**

Шумілінскае спажыўтаварыства цяпер знаходзіцца ў стадыі банкруцтва. Усе гандлёвыя аб'екты, якія ўваходзілі ў яго склад, было вырашана перадаць у арэнду Бешанковіцкай кааперацыі. Прадаўцы таксама пераводзяцца ў гэту арганізацыю. Што да крамы ў Лескавічах, то новы арандатар спачатку не надта хацеў яе браць — з-за дрэннага стану. Але пытанне ўдалося вырашыць. Адкрыць ужо адрамантаваны магазін павінны 1 снежня.

У тым, што аб'ект у будучыні, магчыма, перададуць прыватнай асобе, Таццяна Вараб'ёва не бачыць нічога страшнага.

— Асартыментны пералік будзе захоўвацца і прыватнікам, і кааперацыяй. Патрабаванні адны і тыя ж, — запэўнівае яна. — Для нас галоўнае — каб у насельніцтва не было нараканняў.

Іншая рэч, што сярод мясцовых прадпрымальнікаў ахвотных трымаць краму на вёсцы няма. Па словах **старшыні Светласельскага сельвыканкама Віктара ШЧАРБАКОВА,** падобныя прапановы ўспрымаюцца без энтузіязму — бізнесменам цікавей адкрывацца ў больш людных месцах. Так, на тэрыторыі сельсавета ёсць толькі адна прыватная кавярня — у вёсцы Язвіна.

Чаму Шумілінская кааперацыя збанкрутавала?

— Прычына — дрэнная гаспадарчая дзейнасць. Канкурэнцыя там не настолькі значная, — упэўнены **старшыня праўлення Віцебскага аблспажыўсаюза Аляксандр ПУЦЯТА.**

Ён дадае, што па сацыяльных стандартах, калі ў населеным пункце пражывае менш за 200 чалавек, краму могуць закрыць. Але кааперацыя звычайна звяртаецца да гэтых мер толькі тады, калі ў вёсцы застаецца менш за 50 чалавек.

— Ёсць вёскі, дзе і па 20—30 жыхароў, але мы трымаем магазін. Бо ёсць у наяўнасці прадаўцы: пенсіянеркі два-тры разы на тыдзень выходзяць на змену, і ўсіх гэта задавальняе, — расказвае Аляксандр Пуцята. — А ўвогуле, складана знайсці работніка, які будзе прыязджаць у вясковую краму, калі разумее, што тавараразварот невялікі, а значыць, і заробак невысокі. Таму працоўныя рэсурсы ў сельскай мясцовасці — адна з асноўных нашых праблем.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*



# ЦІ МОЖА РАЙПО БЫЦЬ ПРЫБЫТКОВЫМ?

**У найбліжэйшы час члены Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі збіраюцца абмяркоўваць пытанні функцыянавання спажывецкай кааперацыі. Удзельнікаў выязнога пасяджэння азнаёмяць з дзейнасцю Пастаўскага райспажыўтаварыства. Напярэдадні наш карэспандэнт пацікавіўся, што ўяўляе сабой сістэма спажывецкай кааперацыі Віцебскай вобласці ў цэлым і канкрэтна ўзятага раёна — у прыватнасці.**

### Накормяць і нарыхтуюць

Паводле слоў **старшыні праўлення Віцебскага аблспажыўсаюза Аляксандра ПУЦЯТЫ,** у сістэму спажывецкай кааперацыі ўваходзяць 18 раённых спажывецкіх таварыстваў і 11 унітарных прадпрыемстваў аблспажыўсаюза.

— У асноўным займаемся гандлем: усяго ў нас каля 1,3 тысячы крам, 63% іх — у сельскай мясцовасці. Больш за 4 тысячы населеных пунктаў абслугоўваюць 160 аўтакрам.

Гандаль «з колаў», як і аб'екты ў невялікіх населеных пунктах, з-за нізкіх аб'ёмаў тавараабароту істотных выдаткаў на ўтрыманне — стратныя. Але калі ў вёсцы жыве нават толькі адзін чалавек, яго трэба забяспечваць таварамі і паслугамі.

Вядома, што ў Беларусі спажывецкая кааперацыя традыцыйна лідар у нарыхтоўчай дзейнасці. На Віцебшчыне яе ажыццяўляюць у 101 пункце. Таксама гэтым займаюцца розничныя гандлёвыя прадпрыемствы. Купляюць больш за 20 відаў сельскагаспадарчай, дзікарослай сыравіны. І не толькі ў грамадзян. У спісе здатчыкаў — фермерскія гаспадаркі, садаводчыя таварыствы і сельскагаспадарчыя кааператывы. Спажывецкая кааперацыя — асноўны нарыхтоўшчык бульбы, агародніны, садавіны, ягад, грыбоў і іншага. За 9 месяцаў года толькі ў грамадзян закуплена сельскагаспадарчай прадукцыі больш чым 13,2 мільёна рублёў.

Каб рэалізоўваць айчынную бульбу і плодаагародніну прадукцыю ў міжсезонны перыяд, функцыянуе 21 сховішча. Там адначасова можна захоўваць больш за 7,6 тысячы тон.

### Па заказах і ў крэдыт

Пастаўская раённая спажыўкааперацыя на працягу 20 гадоў займае лідзіруючае месца не толькі ў вобласці, але і ва ўсёй рэспубліцы. Тройчы назва калектыву была занесена на Рэспубліканскую дошку Гонару. Двойчы працоўны калектыў за ўклад ва ўмацаванне эканомікі краіны і стабільнае развіццё атрымліваў падзячны ліст ад Прэзідэнта.

> ❍ **Сёлета па ўсёй вобласці адрамантавалі і рэканструявалі больш за 100 крам.**
>
> ❍ **Удзельная вага спажывецкай кааперацыі ў розничным тавараабароце Прыдзвіння — 8,7%.**

Як адзначыў **Рыгор ЛЕЎКАВЕЦ, старшыня праўлення Пастаўскага раённага спажывецкага таварыства,** у яго больш за 800 падначаленых. Яны працуюць для 36 тысяч землякоў, у тым ліку 12,1 тысячы вяскоўцаў.

— Маем каля 90 крам, больш чым палова якіх — у вёсках. Туды, дзе мала жыхароў, прыязджаюць 10 аўтакрам, — расказвае ён.

У раёне адкрываюцца крамы, не горшыя, чым у абласным цэнтры. Напрыклад, крама №24 «Родны кут». Яе гандлёвая плошча перавышае 500 «квадратаў». Сярод іншага ёсць нават акварыум для рэалізацыі жывой рыбы. Для пастаянных пакупнікоў укаранілі сістэму зніжак (выдаюць дысконтныя карты). Сярэднямесячны тавараабарот — 250,4 тысячы рублёў.

Ва ўсіх крамах арганізаваны продаж па папярэдніх заказах насельніцтва. Актыўна развіваецца гандаль прамысловымі і харчовымі таварамі ў крэдыт.

### Залатыя і сярэбраныя

Летась на Сусветнай кулінарнай алімпіядзе ў Германіі майстар-кандытар Святлана Карандашава заваявала сярэбраны медаль, а майстар-повар Галіна Зямчонак — бронзавы. Яна ж сёлета на рэспубліканскім міжгаліновым конкурсе прафесійнага майстэрства «Беларускі майстар — 2017» сярод кухараў-кулінараў узяла Гран-пры.

Эксперты далі высокую ацэнку і прадукцыі райпо. У прыватнасці, у мінулым годзе на рэспубліканскім аглядзе якасці хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў «Смаката-2016» хлябы «Мурамскі аматарскі» і «Манастырскі» заваявалі сярэбраныя медалі. А хлеб «Царскі з сухафруктамі» — Гран-пры. Былі і іншыя ўзнагароды...

— Неаднаразова на рэспубліканскіх конкурсах «Найлепшыя тавары года Рэспублікі Беларусь» («Ласунак») прадукцыя мяснога і кандытарскіх цэхаў узнагароджвалася дыпломамі і ганаравалася званнем лаўрэата, — працягвае Рыгор Леўкавец.

### І турызмам займаюцца

Пастаўскае райспажыўтаварыства аказвае насельніцтву больш за 20 відаў паслуг. Сюды ўваходзяць, напрыклад, апрацоўка драўніны, забой жывёлы, камплектаванне падарункаў, рытуальныя паслугі, пракат і іншае...

Займаюцца і, на першы погляд, нестандартнай для такой арганізацыі дзейнасцю. Пазалетась у вёсцы Ширкі ўведзены ў эксплуатацыю комплекс для ажыццяўлення сельскага турызму. База адпачынку знаходзіцца ў маляўнічым кутку. Там ёсць магчымасць адпачыць на прыродзе, правесці карпарацыйныя мерапрыемствы (дзіцячыя і дарослыя дні нараджэння, юбілеі і вяселлі). І ўсё гэта, заўважце, па даступных цэнах...

Шмат гадоў райпо рэнтабельны ва ўсіх кірунках.

У Пастаўскім раёне нават ёсць музей спажывецкай кааперацыі. Ужо каля 13 гадоў ён функцыянуе ў галоўным адміністрацыйным будынку. Там можна ўбачыць каля 800 экспанатаў, звязаных з гісторыяй стварэння і развіцця мясцовай кааперацыі: з 1939 года па цяперашні час.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*